## Апошняя пасада былога наркама

У 1929 г. дырэктарам Палескай пясчанай сельскагаспадарчай станцыі, якая знаходзілася ў Скрыгалаве, быў прызначаны Д. Ф. Прышчэпаў. Раскручвалася страшнае кола масавых рэпрэсій, і Дзмітрый Філімонавіч, першы народны камісар земляробства, адзін з першых трапіў пад яго. Абвінавачаны ў здрадзе Радзіме, ва ўсемагчымых ухілах, «шкодных думках», ён быў зняты з усіх пасад, выключаны з партыі, двойчы прыгавораны да расстрэлу...

Нарадзіўся Д. Ф. Прышчэпаў у 1896 г. на Віцебшчыне. Пасвіў кароў, батрачыў, потым — акопы першай сусветнай вайны, якія сталі своеасаблівымі універсітэтамі будучага вучонага. У грамадзянскую вайну яму даверылі камандаванне атрадам, потым палком Чырвонай Арміі, яго выбіраюць старшынёю Сенненскага павятовага выканкама і рэўкама.

Наступілі мірныя гады. Землякі выбралі Д. Ф. Прышчэпава намеснікам старшыні Віцебскага губернскага выканкама, затым ён працаваў намеснікам наркама земляробства. У 1924 г. абраны народным камісарам земляробства Беларусі. Пяць гадоў працаваў ён на гэтай пасадзе — так, як падказвала сумленне, сялянскі розум і прыродная кемлівасць. А ў 1929 г. здарылася бяда. Дзмітрыя Філімонавіча абвінавацілі ў тым, што ён хацеў, каб сяляне жылі заможна. Прышчэпаў быў супраць паскоранай, часта неабдуманай калектывізацыі.

Усяго два гады працаваў Дзмітрый Філімонавіч на Мазыршчыне. Незабыўны след пакінуў ён у рабоце навуковай доследнай станцыі, у яе гаспадарчым уладкаванні, паляпшэнні жыцця ў вёсцы. У Скрыгалаве дзякуючы Дзмітрыю Філімонавічу з'явілася электрычнасць. Ён дабіўся ў Саўміне выдзялення паравога лакамабіля і турбіны, іншага абсталявання. Лакамабіль быў дастаўлены па Прыпяці, а ад прыстані да вёскі — на валах. Вырашаліся многія іншыя пытанні па ўмацаванні матэрыяльнай базы станцыі, падборы кадраў. Станцыя была пераўтворана ў сельскагаспадарчы саўгас-тэхнікум — першую навучальную ўстанову на Палессі.




Помнік расстраляным у 1937—1939 гг. Па дарозе Міхалкі — Рудня Міхалкаўская

У ліпені 1930 г. Дзмітрый Філімонавіч быў арыштаваны і прыгавораны да 10-гадовага турэмнага зняволення. Карэлія, Сібір, Калыма — месцы пакут Д. Ф. Прышчэпава. У чэрвені 1937 г. быў датэрмінова вызвалены, але праз месяц, па дарозе на радзіму — новы арышт, тое ж самае абвінавачанне — і прыгавор да вышэйшай меры пакарання...

*М. Капач*

### СА СПРАВАЗДАЧЫ МАЗЫРСКАГА АКРУЖКАМА КП(б) БЕЛАРУСІ ЗА ЧАС ПАСЛЯ II АКРУГОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ З 6.6.1937 г. ПА 15.9.1937 г.

...Окружная парторганизация провела большую разоблачительную работу по очищению парторганизации от троцкистов и прочих врагов партии и народа. Всего исключено из партии за отчетный период 119 членов и кандидатов, в т. ч. 37 человек исключены как враги народа, 19 человек за связь с врагами народа, 12 троцкистов, 9 за связь с троцкистами, 10 за сопротивление исправлению последствий вредительства и 32 человека по другим причинам.

Анализ причин исключения показывает, что абсолютное большинство исключенных являлись врагами народа, врагами партии. Наиболее характерными из исключенных являются следующие: Бычковский — бывший секретарь окружкома ЛКСМБ, Гольдкварц — бывший редактор окружной газеты «Большевик Полесья», Драп — директор школы, и другие.

...Во главе руководства окружного совета Осоавиахима находился ставленник врага народа Милонова — Максимов, ныне исключенный из партии...

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 69. Воп. 4. Спр. 13. Л. 3.*

## Праходзіў па «мазырскай справе»

Адным з палітычных працэсаў на Беларусі ў канцы 30-х гадоў была так званая «мазырская справа». У ліпені 1938 г. яна набыла рэспубліканскі маштаб. Арыштавалі 17 чалавек, у асноўным дзяржаўных і партыйных дзеячаў, у тым ліку А. А. Ананьева.

Анатоль Андрэевіч меў тры класы адукацыі. Служыў у Чырвонай Арміі, у 1933 г. яго адкамандзіравалі ў распараджэнне ЦК ВКП(б).

Працоўная дзейнасць А. А. Ананьева ў Беларусі пачалася ў 1935 г. на Мазыршчыне, тут ён усё вышэй падымаўся па службовых прыступках. У 1937 г. А. А. Ананьеў — сакратар акружкама партыі. З Мазыра яго пераводзяць на пасаду намесніка старшыні СНК БССР, потым некалькі месяцаў ён працаваў сакратаром Віцебскага абкама КП(б)Б, а неўзабаве А. А. Ананьеў быў прызначаны другім сакратаром ЦК КП(б)Б.

Трагічны быў далейшы шлях гэтага чалавека. Арышт, турма, допыты... На допыце 16 студзеня 1939 г., магчыма, пад дыктоўку следчага Анатоль Андрэевіч паказаў, што ў чэрвені — ліпені 1936 г. атрымаў заданне падрыхтаваць




Выпуск курсаў тэхнікаў-жывёлаводаў. 1932

тэрарыстычны акт супраць К. Я. Варашылава, які павінен быў прыехаць у Беларусь на тактычныя вучэнні. «...Нам трэба было падрыхтаваць «дом паляўнічага», каб, па прыездзе Варашылава ў Беларусь, запрасіць яго на паляванне і здзейсніць тэракт... Мне было даручана падрыхтаваць людзей, так званых «паляўнічых». У абвінаваўчым заключэнні па «справе семнаццаці» гэтыя паказанні, дапоўненыя іншымі вымысламі, выліліся ў фармуліроўку: «Абвінавачваныя па гэтай справе з'яўляліся ўдзельнікамі правацэнтрысцкай арганізацыі, якую ўзначальвалі Шаранговіч, Галадзед, Чарвякоў і Гікала, атрымалі заданне Рыкава падрыхтаваць і здзейсніць тэракт над наркамам абароны СССР Маршалам Савецкага Саюза К. Я. Варашылавым і правялі да гэтага падрыхтоўку. А. А. Ананьеў паказаў, што прамым вынікам наўмысных шкодніцкіх дзеянняў з'явілася нізкая ўраджайнасць, мізэрныя працадні калгаснікаў і да т. п. Каб выклікаць нездавальненне сярод калгаснікаў палітыкай савецкага ўрада, удзельнікі нацыянал-фашысцкай арганізацыі сабатавалі сталінскі статут сельгасарцелі, рашэнні партыі і ўрада аб надзяленні калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі».

З пратакола закрытага судовага пасяджэння ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 27 мая 1940 г. вынікае, што А. А. Ананьеў свае паказанні, дадзеныя ім на папярэднім следстве, на судзе не пацвердзіў. «Я мусіў даваць такія паказанні, бо з першага дня допыту мяне збівалі», — заявіў ён.

29 мая 1940 г. ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР за падрыў дзяржаўнай прамысловасці, транспарту, гандлю, грашовай абарачальнасці прыгаварыла А. А. Ананьева да 20 год папраўча-працоўных лагераў з наступным пазбаўленнем на 5 год палітычных правоў. Ён памёр 25 мая 1942 г. у перасыльнай турме ў Саратаўскай вобласці.

*В. Грыгор'еў*

**В партии восстановить посмертно...**

Степан Матвеевич Романенко в партию вступил в декабре 1918 года в возрасте 27 лет. Работал секретарем Оршанского, Мстиславского, Тереховского, Богушевского райкомов КП(б)Б, вторым секретарем Мозырского окружкома партии. С мая 1937 по январь 1938 г. — председатель Мозырского окрисполкома. С февраля по август 1938 года был председателем оргкомитета ЦИК БССР по Полесской области. 27 августа арестован органами НКВД, а в ноябре решением III Пленума ЦК КП(б)Б исключен из партии и членов ЦК КП(б) как «враг народа».

С. М. Романенко были предъявлены стандартные обвинения, что, «будучи вторым секретарем Мозырского окружкома КП(б)Б, преступно халатно относился к своим обязанностям, в результате чего имели место искривления налоговой политики, выражавшиеся в переобложении крестьянских хозяйств и незаконном изъятии и реализации имущества у неплательщиков. Не пресекал нарушения устава сельхозартели по отводу приусадебных участков колхозникам и земли единоличникам, не принимал всех зависящих от него мер к ликвидации инфекционных заболеваний лошадей, что снижало рост конского поголовья».

В мае 1940 года военная коллегия Верховного суда СССР приговорила С. М. Романенко к лишению свободы сроком на четыре года без поражения в правах, с отбытием наказания в исправительно-трудовых лагерях. Позже он умер в заключении...

При рассмотрении дела в военной коллегии Верховного суда СССР Степан Матвеевич сказал: «Я прошу суд при вынесении приговора учесть, что у меня, пробывшего 20 лет в партии, не было никаких предпосылок сделаться врагом народа, как я в том признался на предварительном следствии. Эти признания были выбиты у меня следователем. Я вступил в коммунистическую партию тогда, когда велась борьба на фронтах

гражданской войны. Я активно участвовал в февральской и Октябрьской революциях. Я всегда честно проводил генеральную линию партии. Я никогда не был врагом народа и никогда им не буду. Прошу дать возможность мне честно работать, как работают миллионы трудящихся нашей страны, и так, как я работал до моего ареста. Я несу ответственность за недочеты в Мозырском районе, но это не было вредительством».

Определением военной коллегии Верховного суда СССР от 4 апреля 1957 года приговор в отношении С. М. Романенко отменен и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

В феврале 1989 года Бюро ЦК КПБ восстановило С. М. Романенко членом КПСС с 1918 года (посмертно).

*«Политический собеседник». 1989. № 4.*

**ДАВЕДКА-ДУБЛІКАТ**

Справа ў адносінах Рэута Лявона Мацвеевіча, 1892 года нараджэння, ураджэнца і жыхара в. Зімавая Буда Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, да арышту 3 жніўня 1937 года — рабочы смалакурнага завода, перагледжана ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі 27 чэрвеня 1978 года.

Пастанова камісіі НКУС і Пракурора СССР ад 28 лістапада 1937 года па абвінавачванні Рэута Лявона Мацвеевіча ў прыналежнасці да шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі і асуджанага да вышэйшай меры пакарання адменена і справа аб ім спынена за адсутнасцю складу злачынства.

Па гэтай справе Рэут Л. М. рэабілітаваны пасмяротна.

Старшыня Беларускага ваеннага суда палкоўнік юстыцыі *П. Лізуноў*

*12 чэрвеня 1996 г.*

## Прозвішчы на абеліску

...Ціхія вясковыя могілкі ў вёсцы Крушнікі, сціплыя помнікі, драўляныя і металічныя крыжы. Помнік з чырвонага граніту на высокім месцы кідаецца ў вочы. Восем прозвішчаў на ім. Усе — Юніцкія. Але пахавана тут толькі Анастасія Барысаўна Юніцкая — жонка, маці, свякроў... Астатнія — муж Юніцкі Антон Пятровіч, сыны Пётр, Фёдар, Яфрэм, Васіль і Іван, нявестка Ефрасіння Іванаўна знайшлі вечны прытулак далёка ад гэтых мясцін, і невядома дакладна — дзе на шматпакутнай мазырскай зямлі... Аб'яднаў іх усіх агульны надпіс на помніку: «Бязвінна расстраляным і пасмяротна рэабілітаваным. Вашыя бязвінныя мукі балюча аддаюцца ў нашых сэрцах. Удзячныя вам дзеці, пляменнікі, унукі».

Жылі ціха і спакойна ў вёсцы, якой была і сама вёска, шчырыя, сумленныя людзі, працаўнікі, гаротнікі. Мала ведалі адпачынку, цяжкім было дзяцінства. Пасвілі жывёлу, аралі, сеялі. Былі добрымі хлебаробамі, будаўнікамі, пчалярамі. Пачалася калектывізацыя. І ў калгасе нядрэнна працавалі. Таму і жылі. Крыху лепш, чым іншыя. Заўсёды мелі кавалак хлеба, а да яго ў святы, у касавіцу — кавалак сала... Гэта выклікала зайздрасць і нянавісць тых, хто не любіў працаваць. Яны сталі «аўтарамі» сігналаў ва ўсе інстанцыі пра тое, што «ў Крушніках звілі сабе гняздо кулакі, ворагі народа і польскія шпіёны...». За некалькі начэй «чорны воран» значна паменшыў колькасць мужчын у Крушніках.

Зніклі бясследна больш як 40 чалавек на чале са старшынёй калгаса А. А. Юніцкім. Забралі і некалькі жонак «ворагаў народа». Прыгавор часцей быў адзін — расстрэл. Вядома, што ў ваколіцах Мазыра расстраляна 33 чалавекі з Крушнікаў. Сярод іх — муж, пяцёра сыноў, нявестка Анастасіі Барысаўны. Такую трагедыю маці трэба было вытрымаць, перажыць... Памерла яна ў 1947 г.




Мемарыяльная дошка, устаноўленая на будынку Свята-Міхайлаўскага сабора ў памяць аб ахвярах палітычных рэпрэсій 1937—1938 гг.

...У гады вайны дзеці і родныя «ворагаў народа» адважна змагаліся з ворагам на фронце, у партызанскіх атрадах. У мірны час працавалі шчыра, сумленна, як Э. П. Юніцкі (бацька і маці, дзед і чатыры дзядзькі якога расстраляны) — вопытны арганізатар вытворчасці, які ўзначальваў буйнейшыя будаўнічыя арганізацыі ў Мазыры і ў Гомелі.

*М. Капач*

**Слаўнае імя**

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі нарадзіўся ў 1867 г., вучыўся ў Мазырскай гімназіі, затым у Кіеўскім універсітэце. Была цікавая работа ў Маскоўскім архіве Міністэрства юстыцыі. З 1899 г. М. В. Доўнар-Запольскі — прыват-дацэнт Маскоўскага універсітэта, праз тры гады — Кіеўскага, прафесар гісторыі, доктар гістарычных навук. У 1925 г. ён працаваў правадзейным членам і кіраўніком гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта ў БДУ.

Навуковая і грамадская дзейнасць Доўнар-Запольскага яшчэ і сёння пасапраўднаму не ацэнена. Гэты вучоны-патрыёт займае пачэснае месца сярод такіх выдатных беларускіх гісторыкаў, як Я. Тышкевіч, А. Кіркор, У. Пічэта, У. Ігнатоўскі. Яго імя вядома не толькі гісторыкам, але і этнографам, фалькларыстам, мовазнаўцам. Ёсць усе падставы назваць Доўнар-Запольскага «бацькам беларускай гістарычнай навукі». Яго гістарычныя працы, напісаныя паводле архіўных матэрыялаў, — «Палітычны лад старажытнай Русі», «Зараджэнне міністэрстваў Расіі», «Нарыс па арганізацыі заходнерускага сялянства», «Нарыс сацыяльна-эканамічнай структуры Беларусі ў XVI — XVIII стст.», «Народная гаспадарка Беларусі 1861—1914 гг.» маюць і сёння вялікую навуковую вартасць...

М. В. Доўнар-Запольскі працаваў у розных навуковых установах Кіева, Мінска, Баку і Масквы, але ўсё жыццё і творчую дзейнасць прысвяціў вывучэнню роднай Беларусі, дзе ён нарадзіўся і вырас. Ён прапаноўваў друкаваць літаратуру на беларускай мове, вывучаць культуру і побыт народа, адкрыць беларускі універсітэт. Жывучы па-за межамі рэспублікі, ніколі не губляў сувязі з беларускімі вучонымі і пісьменнікамі, цікавіўся падзеямі, якія тут адбываліся. Менавіта М. В. Доўнар-Запольскі ўдакладніў этнічныя межы Беларусі. Ён улічыў усе фактары — ад лінгвістычных да культурна-эканамічных і гістарычных — пры вызначэнні месцаў пасяленняў беларусаў. Граніца паміж Украінай і Беларуссю праходзіць і цяпер амаль так, як яе вызначыў гісторык.

Ён думаў пра Беларусь, імкнуўся сюды, запісваў народныя песні, вывучаў быт, рабіў археалагічныя раскопкі... На жаль, чорнае крыло сталіншчыны не мінула і М. В. Доўнар-Запольскага, яго добрае імя на доўгі час было забыта.

Загінуў М. В. Доўнар-Запольскі ў 1934 г.

*Г. Каханоўскі*

М. А. Адамовіч



## Вернутыя з забыцця

Расстраляны, расстраляны, высланы ў Сібір, памёр у зняволенні... Сотні ахвяр сталінскіх рэпрэсій 30-х гадоў... Адпаведнымі судовымі інстанцыямі ўсе яны рэабілітаваныя ў пасляваенны час, але такім жа неабходным актам у адносінах да бязвінных пакутнікаў з'яўляецца і публікацыя іхніх імёнаў у гэтай кнізе. Ніхто іх не верне ўжо з вечнага небыцця, але галоснае вяртанне ні ў чым не вінаватых людзей з ганебнага забыцця стане хоць бы малым суцяшэннем іхнім нашчадкам, а ўсім нам — суровым папярэджаннем, каб на роднай зямлі такое ніколі больш не паўтарылася... Вось ён, магчыма, яшчэ не поўны спіс нашых землякоў, якія загінулі ў гады масавых палітычных рэпрэсій:

### ГОРАД МАЗЫР

**АБРАМАЎ Уладзімір Карнеевіч,** н. у 1903, расстраляны 16.2.1938.

**АДАМОВІЧ Міхаіл Аляксандравіч,** н. у 1904, расстраляны 24.12.1937.

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Аляксандр Іванавіч,** н. у 1865, быў святаром, расстраляны ў 1938.

**АЛЬХА Рыгор Дзмітрыевіч,** н. у 1900, расстраляны ў 1938.

**АЛЬШЭЎСКІ Уладзіслаў Вікенцьевіч,** н. у 1867, расстраляны 11.3.1938.

**АРОНАЎ Навум Мееравіч,** н. у 1897, працаваў загадчыкам аддзела мясцовай прамысловасці Мазырскага акруговага выканкама, расстраляны 30.10.1937 у Мінску.

**БАЛЮК Іван Сцяпанавіч,** н. у 1898, расстраляны 24.12.1937.

**БАРАВІК Апанас Іванавіч,** н. у 1893, працаваў бухгалтарам рыбучастка, расстраляны 11.3.1938.

**БАРАНОЎСКІ Леанід Антонавіч,** н. у 1891, расстраляны 28.1.1938.

**БЕЖЫК Іван Паўлавіч,** н. у 1873, працаваў рахункаводам калгаса, расстраляны 16.2.1938.

**БЕКАРЭВІЧ Васіль Фёдаравіч,** н. у 1896, быў святаром, расстраляны 20.10.1937.

**БІБІК Клім Карнеевіч,** н. у 1878, расстраляны 22.3.1933.

**БЛІНКОЎСКІ Вячаслаў Казіміравіч,** н. у 1891, расстраляны 24.12.1937.

**БОБР Іван Кандратавіч,** н. у 1898, расстраляны 16.2.1938.

**БОБР Піліп Архіпавіч,** н. у 1872, працаваў возчыкам на фабрыцы «Прафінтэрн», расстраляны 16.2.1938.

**БОБР Уладзімір Цярэнцьевіч,** н. у 1888, расстраляны 16.2.1938.

**БЫЧКОЎСКІ Антон Антонавіч,** н. у 1911, працаваў сакратарам Мазырскага акружкама камсамола, расстраляны 24.11.1937 у Мінску.

**БЯРНАЦКІ Клім Карнеевіч,** н. у 1878, расстраляны 22.3.1933.

**ВАРШАЎСКІ Станіслаў Юльянавіч,** н. у 1906, працаваў загадчыкам Мазырскага акружнога фінансавага аддзела, расстраляны 30.10.1937 у Мінску.

**ВІЗАНОВІЧ Юрый Васілевіч,** н. у 1884, расстраляны 24.12.1937.

**ВОЛЬФМАН Генах Моўшавіч,** н. у 1897, расстраляны 29.12.1937.

**ГАЛАВАЦКІ Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1913, расстраляны 16.2.1938.

**ГАРАДЗЕЦКІ Моўша Фрэімавіч,** н. у 1913, расстраляны 24.12.1937.

**ГАРЭЛАЎ Аляксандр Піліпавіч,** н. у 1893, расстраляны 22.5.1938.

**ГАЎШТЭЙН Лейзер Пейсахавіч,** н. у 1905, расстраляны 29.12.1937.

**ГАЎШТЭЙН Янкель Ісаравіч,** н. у 1898, расстраляны 29.12.1937.

**ГАЯВЫ Тарас Дзям'янавіч,** н. у 1871, вартаўнік царквы, расстраляны 11.3.1938.

**ГЕЙШТЭР Антон Міхайлавіч,** н. у 1890, працаваў начальнікам Мазырскай сплаўной канторы, расстраляны 30.10.1937.

**ГЛЕЗА Іван Антонавіч,** н. у 1895, расстраляны 28.1.1938.

**ГЛІНСКІ Уладзімір Сцяпанавіч,** н. у 1890, працаваў бухгалтарам арцелі «Молат», расстраляны 16.2.1938.

**ГОФМАН Давід Сіманавіч,** н. у 1897, працаваў загадчыкам магазіна «Белплодаагародніна», расстраляны 3.3.1938.

**ГУЛЕЦКІ Васіль Іванавіч,** н. у 1890, расстраляны 29.12.1937.

**ГУЛЬБІНОВІЧ Андрэй Андрэевіч,** н. у 1874, працаваў механікам электрастанцыі, расстраляны 19.11.1937.

**ГУРАЛІС Віктар Восіпавіч,** н. у 1913, расстраляны 24.12.1937.

**ГУРЫН Васіль Паўлавіч,** н. у 1866, расстраляны 5.1.1938.

**ДАМАШЭВІЧ Сафрон Фёдаравіч,** н. у 1900, расстраляны 22.11.1938.

**ДЗЕЛЯС Браніслаў Купрыянавіч,** н. у 1897, расстраляны 28.1.1938.

**ДЗЕНІШЧУК Станіслаў Купрыянавіч,** н. у 1900, расстраляны 29.12.1937.

**ДЗІКАН Ігнат Кузьміч,** н. у 1902, працаваў цесляром на Мазырскай электрастанцыі, расстраляны 11.3.1938.

**ДРОЗД Ісідар Піліпавіч,** н. у 1884, расстраляны 20.10.1937.

**ДУБЕРШТЭЙН Іван Карлавіч,** н. у 1897, расстраляны 27.4.1938.

**ДУБІНА Антон Васілевіч,** н. у 1885, працаваў старшынёй Мазырскага акрвыканкама, расстраляны 29.10.1937.

**ДУБІНСКІ-ІВАШКЕВІЧ Мікалай Лаўрэнцьевіч,** н. у 1904, расстраляны 22.5.1938.

**ДУБРАВІЦКІ Майсей Нахімавіч,** н. у 1900, расстраляны ў 1938.

**ДУБРАЎ Аляксандр Акімавіч,** н. у 1868, расстраляны 16.2.1938.

**ДУБРАЎ Яўхім Міхайлавіч,** н. у 1894, расстраляны 11.3.1938.

**ЕФІМОВІЧ Андрэй Вікенцьевіч,** н. у 1898, расстраляны 29.12.1937.

**ЗАХАРАЎ Іван Іванавіч,** н. у 1878, працаваў загадчыкам базы Мазырскага рыбучастка, памёр у 1944 у месцы зняволення.

**ЗУБАР Кузьма Сцяпанавіч,** н. у 1895, расстраляны 29.12.1937.

**ІВАШКЕВІЧ Клаўдзія Аляксандраўна,** н. у 1900, расстраляна 14.10.1938.

**ІВАШКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч,** н. у 1894, расстраляны 29.12.1937.

**КАТЛЯРОЎСКІ Саламон Абрамавіч,** н. у 1901, расстраляны 28.7.1938.

**КУЗЬМЕНКА Андрэй Васілевіч,** н. у 1871, служачы рэлігійнага культу, расстраляны 11.3.1938.

**КУЗЬМІЧ Янкель Натанавіч,** н. у 1888, расстраляны 11.3.1938.

**КУНЕЦ Восіп Якаўлевіч,** н. у 1895, расстраляны 24.12.1937.

**ЛАНЬКО Пётр Якаўлевіч,** н. у 1895, расстраляны 7.12.1937.

**ЛЕВАНЧУК Іван Паўлавіч,** н. у 1864, расстраляны 11.3.1938.

**ЛЕВІН Афроім Абрамавіч,** н. у 1885, працаваў упаўнаважаным Народнага камісарыята нарыхтовак па Мазырскім раёне, арыштаваны 2.7.1938, асуджаны 6.2.1940 на 5 гадоў зняволення, дзе і памёр 16.1.1944.

**ЛЕВІН Яўсей Якаўлевіч,** н. у 1898, працаваў сакратаром Мазырскага райкама КП(б)Б, арыштаваны ў 1938, асуджаны 29.5.1940 на 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

**ЛЁТКІН Уладзімір Міхайлавіч,** н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

**ЛІПСКІ Мацвей Васілевіч,** н. у 1892, расстраляны 27.9.1937.

**ЛУШКАРОЎ Сяргей Фаміч,** н. у 1904, расстраляны 7.12.1937.

**ЛЯСОТА Іван Мар'янавіч,** н. у 1883, расстраляны 24.12.1937.

**МАЗАЛЕЎСКІ Іван Васілевіч,** н. у 1875, расстраляны 5.1.1938.

**МАСЛА Андрэй Паўлавіч,** н. у 1889, расстраляны 27.9.1937.

**МІШКЕВІЧ Арэст Вікенцьевіч,** н. у 1871, расстраляны 19.10.1937.

**МУРАШКА Якім Паўлавіч,** н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

**МЯДЗВЕДЗЬ Аляксей Максімавіч,** н. у 1888, расстраляны 16.2.1938.

**МЯДЗВЕДЗЬ Фёдар Захаравіч,** н. у 1874, расстраляны 11.3.1938.

**НАЛІВАЙКА Апанас Якімавіч,** н. у 1903, начальнік штаба дывізіі, расстраляны 24.4.1938.

**ПАДАЛІНСКІ Дзямід Назаравіч,** н. у 1894, расстраляны 24.4.1938.

**ПАЛЕЙ Іосіф Шаламавіч,** н. у 1884, расстраляны 29.12.1937.

**ПАТАПЧУК Несцер Гардзеевіч,** н. у 1903, расстраляны 27.4.1938.

**ПАТАПЧУК Павел Гардзеевіч,** н. у 1904, расстраляны 27.4.1938.

**ПАЦАПНЯ Даніла Сцяпанавіч,** н. у 1888, расстраляны 5.1.1938.

**ПРАТАСАВІЦКІ Мікалай Міхайлавіч,** н. у 1895, расстраляны 7.12.1937.

**ПРОХАРАЎ Яўген Сямёнавіч,** н. у 1890, працаваў прарабам на будоўлі, расстраляны 16.2.1938.

**ПРЫБЫЛОЎ Іосіф Эдуардавіч,** н. у 1908, працаваў інструктарам Мазырскага аддзялення Дзяржбанка, расстраляны 11.3.1938.

**ПРЫШЧЭПА Іван Сямёнавіч,** н. у 1895, расстраляны 27.9.1937.

**ПУРЫХ Ізраіль Лейзеравіч,** н. у 1907, працаваў дырэктарам мукамольнага трэста, расстраляны ў 1938.

**ПЫШНЯК Барыс Міхайлавіч,** н. у 1900, расстраляны 16.2.1938.

**ПЯТКЕВІЧ Антон Антонавіч,** н. у 1897, працаваў планавіком-эканамістам, расстраляны ў 1938.

**ПЯЧКОЎСКІ Вікенцій Васілевіч,** н. у 1874, працаваў фельчарам, расстраляны 16.2.1938.

**РАЖКО Андрэй Фёдаравіч,** н. у 1893, расстраляны 29.12.1937.

**РАМАНЕНКА Сцяпан Мацвеевіч,** н. у 1891,

працаваў старшынёй Мазырскага акружнога выканкама, з лютага 1938 — старшынёй аргкамітэта ЦВК БССР па Палескай вобл., арыштаваны 27.8.1938, асуджаны 5.5.1940 на 4 гады зняволення, дзе і памёр у 1941.

**РАНЦЭВІЧ Дзмітрый Андрэевіч,** н. у 1889, расстраляны 16.2.1938.

**РАТНЕР Залман Мордухавіч,** н. у 1915, працаваў сакратаром Мазырскага райкама ЛКСМБ, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**РАШУТНЯК Міхаіл Лук'янавіч,** н. у 1910, працаваў механікам аўтабазы, расстраляны 29.11.1937.

**РУДЗЬКО Іван Рыгоравіч,** н. у 1916, расстраляны 16.2.1938.

**РУСІЛКА Кліменцій Аляксандравіч,** н. у 1898, расстраляны 22.5.1938.

**РЭХТМАН Гірш Шлёмавіч,** н. у 1894, расстраляны 11.3.1938.

**САВЕНКА Адам Кандратавіч,** н. у 1904, расстраляны 11.3.1938.

**САКАЛОЎ Міхаіл Паўлавіч,** н. у 1903, расстраляны 28.1.1938.

**САЛАВЕЙ Іван Цімафеевіч,** н. у 1912, працаваў загадчыкам сельгасаддзела рэдакцыі газеты «Бальшавік Палесся», расстраляны 5.1.1938.

**САПРЫНОЎСКІ Яўген Іосіфавіч,** н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

**САСНАВЕЦ Захар Іванавіч,** н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

**СВЯНЦЕЦКІ Банед Віктаравіч,** н. у 1903, расстраляны 7.12.1937.

**СВЯНЦЕЦКІ Карл Іванавіч,** н. у 1902, расстраляны 29.11.1937.

**СІНКЕВІЧ Іван Паўлавіч,** н. у 1892, расстраляны 24.12.1937.

**СЛАВУЦІН Барыс Зусевіч,** н. у 1902, расстраляны 24.12.1937.

**СМІРНОЎ Павел Цітавіч,** н. у 1882, расстраляны 20.10.1937.

**СЧАСНЫ Фама Сцяпанавіч,** н. у 1907, расстраляны 29.12.1937.

**ТРОЦ Іван Андрэевіч,** н. у 1897, працаваў намеснікам дырэктара лесазавода «Пралетарый», расстраляны 22.11.1938.

**ФЕШЧАНКА Піліп Кандратавіч,** н. у 1883, расстраляны 20.10.1937.

**ФІАЛКАЎ Майсей Яўсеевіч,** н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

**ФРЫДМАН Самуіл Годзіч,** н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

**ХАМЕНКА Мечыслаў Антонавіч,** н. у 1911, расстраляны 27.4.1938.

**ХАРКАВЕЦ Цімафей Парфіравіч,** н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

**ЦЕЛЯПУН Данііл Іванавіч,** н. у 1902, расстраляны 5.1.1938.

**ЦІХАНАЎ Фёдар Іванавіч,** н. у 1901, расстраляны ў 1937.

**ЧАРНЕЦКІ Канстанцін Вікенцьевіч,** н. у 1893, расстраляны 29.12.1937.

**ЧУГАЙ Антон Антонавіч,** н. у 1912, расстраляны 21.7.1938.

**ШАДЗЬКО Франц Андрэевіч,** н. у 1907, расстраляны 21.7.1938.

**ШАХНО Мікалай Іванавіч,** н. у 1871, расстраляны 11.3.1938.

**ШВЕР Антон Сідаравіч,** н. у 1879, расстраляны 20.10.1937.

**ШПАКОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч,** н. у 1893, расстраляны 22.5.1938.

**ШУМАК Максім Пракопавіч,** н. у 1890, расстраляны 5.1.1938.

**ШУМАК Павел Арцёмавіч,** н. у 1871, расстраляны 16.2.1939.

**ШУМАК Прохар Якаўлевіч,** н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

**ШЫЛЯНОК Васіль Іванавіч,** н. у 1904, працаваў сакратаром Мазырскага акрвыканкама, расстраляны 29.12.1937.

**ШЧЫПАНАЎ Іван Пятровіч,** н. у 1875, слесар Мазырскай электрастанцыі, расстраляны 11.3.1938.

**ЭЛЬКІН Якаў Беньямінавіч,** н. у 1899, расстраляны 30.10.1937.

**ЯКУБОЎСКІ Віктар Адамавіч,** н. у 1908, расстраляны 28.1.1938.

**ЯНЧАРУК Аляксандр Лаўрэнцьевіч,** н. у 1907, расстраляны 27.4.1938.

**ЯРМАК Павел Пятровіч,** н. у 1895, расстраляны 27.9.1937.

## АСАВЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АСАВЕЦ

**ДУБЕНЬ Захар Фёдаравіч,** н. у 1890, высланы ў 1934 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

**ПАШАК Іван Іванавіч,** н. у 1899, расстраляны 25.5.1938.

**УШЧЭНКА Яўгеній Міхайлавіч,** н. у 1909, расстраляны 28.1.1938.

### ВЁСКА АСАВЕЦКАЯ БУДА

**БЯЛЯЦКІ Адам Іпалітавіч,** н. у 1870, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**КАРАСЕВІЧ Ігнат Сцяпанавіч,** н. у 1871, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

### ВЁСКА ГІНЕВІЧАЎ ГРУД

**БЫЧКОЎСКІ Макар Аляксандравіч,** н. у 1861, высланы ў 1933 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

**ПАШАК Андрэй Пятровіч,** н. у 1890, высланы ў 1934 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

### ВЁСКА ГЛІНІЦА

**ВЫСОЦКІ Сяргей Барысавіч,** н. у 1886, высланы ў 1933 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

**РАДАЎНЯ Карп Назаравіч,** н. у 1900, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

**ЦАЛКА Пётр Мікалаевіч,** арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

## ВЁСКА ЗІМАВАЯ БУДА

**ЖУРАЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч,** н. у 1872, расстраляны 10.11.1937.

**КАШЭВІЧ Аляксандр Андрэевіч,** н. у 1897, расстраляны 7.11.1937.

**КАШЭВІЧ Іван Казіміравіч,** калгаснік, расстраляны 16.2.1938.

**КАШЭВІЧ Пётр Казіміравіч,** н. у 1894, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 16.2.1938.

**КАШЭВІЧ Іван Канстанцінавіч,** н. у 1899, арыштаваны ў 1937, памёр у лагеры 25.3.1938.

**КАШЭВІЧ Рыгор Адамавіч,** н. у 1870, расстраляны 26.10.1937.

**РЭВУТ Васіль Адамавіч,** н. у 1881, расстраляны 26.10.1937.

**РЭВУТ Іван Мацвеевіч,** н. у 1904, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**РЭВУТ Іосіф Мікалаевіч,** н. у 1881, расстраляны 2.11.1937.

**РЭВУТ Лявон Мацвеевіч,** н. у 1902, расстраляны 5.1.1938.

**РЭВУТ Міхаіл Мацвеевіч,** н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**РЭВУТ Уладзімір Васілевіч,** н. у 1903, расстраляны 7.12.1937.

**РЭВУТ Уладзімір Мацвеевіч,** н. у 1899, расстраляны 7.12.1937.

**ХМЯЛЕЎСКІ Пілін Фёдаравіч,** н. у 1883, расстраляны 5.1.1938.

**ЧЫРЫЧ Лявон Рыгоравіч,** н. у 1898, расстраляны 5.1.1938.

**ЯШЧЫКОЎСКАЯ Кацярына Рыгораўна,** н. у 1894, расстраляна 26.10.1937.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Антон Аляксандравіч,** н. у 1868, расстраляны 26.10.1937.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Іван Іосіфавіч,** н. у 1859, арыштаваны ў 1938, памёр у лагеры 17.11.1938.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Лук'ян Антонавіч,** н. у 1921, арыштаваны ў 1937, загінуў у лагеры ў 1943.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Міхаіл Іванавіч,** н. у 1905, расстраляны 26.10.1937.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Рыгор Станіслававіч,** н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Сямён Іванавіч,** н. у 1900, расстраляны 16.2.1938.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Фёдар Станіслававіч,** н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

**ЯШЧЫКОЎСКІ Яўхім Іванавіч,** н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

## ВЁСКА КАМЕНЬ

**МАРЦІНОВІЧ Фёдар Арэнавіч,** н. у 1879, расстраляны 16.2.1938.

## ВЁСКА КРУШНІКІ

**ЗДАНЕВІЧ Карп Іванавіч,** н. у 1895, забіты пры арышце ў 1937.

**ЗДАНЕВІЧ Уладзімір Іванавіч,** н. у 1881, расстраляны 24.11.1937.

**ЗДАНЕВІЧ Фёдар Іванавіч,** н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

**КАШАЕД Павел Пятровіч,** н. у 1892, расстраляны 26.10.1937.

**КАШАЕД Пётр Фёдаравіч,** н. у 1884, расстраляны 16.2.1938.

**КАШАЕД Рыгор Мікалаевіч,** н. у 1888, расстраляны 24.12.1937.

**КАШАЕД Фёдар Фёдаравіч,** н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

**КАШЭВІЧ Іосіф Іванавіч,** н. у 1902, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**КАШЭВІЧ Іосіф Мікалаевіч,** н. у 1900, расстраляны 26.10.1937.

**КАШЭВІЧ Франц Мікалаевіч,** н. у 1891, расстраляны 26.10.1937.

**КРУПА Дзмітрый Юльянавіч,** н. у 1890, расстраляны 1.12.1937.

**КРУПА Лявон Пятровіч,** н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

**КРУПА Мікалай Іванавіч,** н. у 1895, расстраляны 26.10.1937.

**КРУПА Пётр Аўгуставіч,** н. у 1865, расстраляны 26.10.1937.

**КРУПА Пётр Іванавіч,** н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**КРУПА Якаў Пятровіч,** н. у 1889, расстраляны 26.10.1937.

**РЭВУЦКІ Андрэй Васілевіч,** н. у 1898, расстраляны 26.10.1937.

**РЭВУЦКІ Апанас Васілевіч,** н. у 1892, расстраляны 26.10.1937.

**ФАЛІНСКАЯ Сабіна Іосіфаўна,** н. у 1887, расстраляна 16.2.1938.

**ФАЛІНСКІ Віктар Іосіфавіч,** н. у 1899, расстраляны 26.10.1937.

**ФАЛІНСКІ Пётр Іосіфавіч,** н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

**ФІЦНЕР Іосіф Адамавіч,** н. у 1889, высланы ў красавіку 1930 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

**ЮНІЦКІ Аляксандр Антонавіч,** н. у 1889, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 26.10.1937.

**ЮНІЦКІ Антон Пятровіч,** н. у 1872, расстраляны 26.10.1937; яго сыны: **Пётр,** н. у 1890, арыштаваны ў 1930, асуджаны на 10 гадоў і загінуў у месцах зняволення, **Фёдар,** н. у 1897, расстраляны 26.10.1937, **Яфрэм,** н. у 1903, расстраляны 26.10.1937, **Васіль,** н. у 1912, расстраляны 26.10.1937, **Іван,** н. у 1914, расстраляны 24.12.1937, нявестка **Ефрасіння Іванаўна ЮНІЦКАЯ,** н. у 1897, расстраляна 20.3.1938.

**ЮНІЦКІ Васіль Антонавіч,** н. у 1912, расстраляны 26.1.1937.

**ЮНІЦКІ Іосіф Іванавіч,** н. у 1904, расстраляны 16.2.1938.



Я. А. Юніцкі

**ЮНІЦКІ Лявон Карпавіч,** н. у 1896, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**ЮНІЦКІ Пётр Юзэфавіч,** н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**ЮНІЦКІ Мацвей Юльянавіч,** н. у 1912, расстраляны 16.10.1938.

**ЮНІЦКІ Юльян Людвікавіч,** н. у 1896, расстраляны 29.2.1937.

**ЮНІЦКІ Антон Адамавіч,** н. у 1884, расстраляны 26.10.1937.

**ЮНІЦКІ Пётр Адамавіч,** н. у 1887, расстраляны 26.10.1937.

**ЮНІЦКІ Мікалай Адамавіч,** н. у 1910, расстраляны 26.10.1937.

**ЮНІЦКІ Міхаіл Іосіфавіч,** н. у 1886, расстраляны 26.10.1937.

**ЮНІЦКІ Пётр Іосіфавіч,** н. у 1887, расстраляны 26.10.1937.

### ВЁСКА КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

**БАГІНСКІ Антон Іванавіч,** н. у 1891, расстраляны 21.7.1938.

**БАГІНСКІ Эдвард Антонавіч,** н. у 1880, расстраляны 21.7.1938.

**БЕРДНІК Якаў Іванавіч,** н. у 1892, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 21.7.1938.

**МАЛАК Караль Антонавіч,** н. у 1911, арыштаваны ў 1937, загінуў у 1943 у Магаданскай вобл.

**ПІНКОЎСКІ Юльян Іосіфавіч,** н. у 1889, расстраляны 19.11.1937.

### ВЁСКА СКАЛОДЗІН

**БАБЁР Станіслаў Іванавіч,** н. у 1890, высланы ў 1932 у Архангельскую вобл., дзе і загінуў.

**ЦАЛКА Іосіф Мікалаевіч,** н. у 1905, высланы ў 1933 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

**ЦАЛКА Мікалай Рыгоравіч,** н. у 1879, сын **Пётр Мікалаевіч,** н. у 1902, **яго жонка і 4 дзяцей,** высланы ў 1932 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

### ВЁСКА СПРЫМАЧОЎ (цяпер не існуе)

**БЕК Павел Іванавіч,** н. у 1866, расстраляны 19.11.1937.

**КОРЖ Фёдар Пятровіч,** н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

**КРУПА Андрэй Юльянавіч,** н. у 1893, расстраляны 24.12.1937.

**КРУПА Уладзімір Юльянавіч,** н. у 1904, расстраляны 24.12.1937.

**МАЗУРКЕВІЧ Уладзімір Ігнатавіч,** н. у 1902, расстраляны 10.2.1937.

**МІЦУРА Мацвей Пятровіч,** н. у 1898, расстраляны 28.5.1938.

**САНЧУКОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч,** н. у 1901, расстраляны 24.12.1937.

**СУРЖЫЦКІ Адам Станіслававіч,** н. у 1907, расстраляны 5.1.1938.

**СУРЖЫЦКІ Арсен Адамавіч,** н. у 1904, расстраляны 16.2.1938.

**ФІЦНЕР Мікалай Адамавіч,** н. у 1889, расстраляны 16.2.1938.

**ФІЦНЕР Пётр Адамавіч,** н. у 1907, расстраляны 5.1.1938.

### ВЁСКА ТУРБІНКА

**ГАЛЕНЯ Рыгор Іванавіч,** н. у 1900, расстраляны 27.11.1937.

**ГАЛІЦКІ Лука Іосіфавіч,** н. у 1870, арыштаваны ў 1937, загінуў у лагеры 3.1.1940.

**ЖУРАЎСКІ Віктар Якаўлевіч,** н. у 1892, расстраляны 21.3.1937.

## БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БАРБАРОЎ

**КОТ Міхаіл Міхайлавіч,** н. у 1892, расстраляны 20.10.1937.

**КУНЕЦ Іосіф Якаўлевіч,** н. у 1895, расстраляны 24.12.1937.

**НАВІЦКІ Сцяпан Яўстратавіч,** н. у 1890, расстраляны 21.7.1938.

**ПІСКУН Канстанцін Ульянавіч,** н. у 1896, расстраляны 20.10.1937.

### ВЁСКА ГОРНАЯ

**АЛЬХОЎСКІ Мечыслаў Іосіфавіч,** н. у 1904, расстраляны 29.11.1938.

## КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

**АНТОНЕНКА Мікалай Васілевіч,** н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

**АСІПОВІЧ Васіль Васілевіч,** н. у 1904, расстраляны 28.1.1938.

